# СВАБОДА

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

№ 22 (37), 28.09 – 4.10. 2006 г.

# ЭРА МІЛАСЭРНАСЦІ

## 44% БЕЛАРУСАЎ НЕ ВЕДАЮЦЬ, ШТО АЛЯКСАНДР КАЗУЛІН СЯДЗІЦЬ У КАЛОНІІ

Такія звесткі прывялі незалежныя сацыёлагі, якія пыталіся ў грамадзян ці чулі яны пра тое, што экс-кандыдата ў прэзідэнты Беларусі Аляксандра Казуліна пасадзілі ў турму на пяць з паловай гадоў? У чым прычына няведання? У замоўчванні прысуду з боку афіцыйнай улады? У слабасці незалежных СМІ? Можа быць, у неміласэрнасці і абыякавасці беларускага грамадства? Ці ў тым, што і не павінны мы гэтага ведаць?

Усё пазнаецца ў параўнанні. Уявіце сабе, каб экс-кандыдата ў прэзідэнты ЗША Джыма Керы ці польскага Доналда Туска пасадзілі ў турму, а палова амерыканцаў ці палякаў пра гэта не ведалі. Нерэальна. З іншага боку, калі Вацлаў Гавел сядзеў у турме ў часы падсавецкай Чэхаславакіі, наогул мала хто з суайчыннікаў ведаў пра гэта. Таму нашы 44% сведчаць якраз пра эфектыўнасць незалежных беларускіх СМІ, а таксама пра тое, што наша грамадства не апынулася ў сітуацыі поўнага таталітарызму. Магчыма, што дэмакраты ў сучаснай Беларусі роўна на гэтыя самыя 44% і ёсць.

Веданне або няведанне ў справе Казуліна зусім не абумоўленае тым, ці насамрэч ён учыніў крымінальнае злачынства і ці справядліва ён сядзіць. Гаворка ідзе пра экс-кандыдата на першую пасаду ў краіне, пра публічнага палітыка, з якім мелі права звязваць свае надзеі не палова, а ўсе беларусы. Няма сумневу, што калі б Казулін учыніў відавочнае злачынства, тады наадварот – пра гэта ведалі б усе, бо ад жадання зганіць суперніка дзейнага прэзідэнта аж захліпаліся б БТ, афіцыёзны друк і сам гэты дзейны прэзідэнт не прамінуў бы лішні раз успомніць пра “марскога пехацінца”. Вось чаму малы працэнт дасведчаных у справе Казуліна кажа якраз пра невінаватасць экс-кандыдата і пра матывы замоўчвання ягонага лёсу ў афіцыйных СМІ.

Казулін быў асабіста набліжаны да Лукашэнкі. Гэтаксама, як у свой час Ганчар, Захаранка і Завадскі, палітычнае знікненне або забойства якіх тлумачыцца ні чым іншым, як асабістай помстай прэзідэнта. Пад гэты “арты-

Працяг тэмы – на стар. 2 і 4




**Вязні за калючым дротам**. *Як стала вядома, Аляксандра Казуліна адправілі ў тую ж калонію, дзе адбывае пакаранне былы дэпутат Нацыянальнага схода, сябра апазіцыйнай дэпутацкай групы «Рэспубліка» Сяргей Скрабец. Пасля таго, як Скрабец абвясціў галадоўку, тамтэйшая адміністрацыя паабяцала, што хутка пачнецца працэс яго ўмоўна-датэрміновага вызвалення.*

*Аляксандр Казулін паведаміў, што пачне бестэрміновую галадоўку 20 кастрычніка.*

*Яшчэ аднаму пакаранаму абмежаваннем волі за свае палітычныя перакананні – Міколу Статкевічу (ён адбывае пакаранне ў вёсцы Блонь Пухавіцкага раёну) пасля 14-ці месяцаў «хіміі» ва ўмоўна-датэрміновым вызваленні адмоўлена.*

*Папраўчая калонія № 3. Пасёлак Віцьба Віцебскай вобласці. Верасень 2006 году.*

*Фота www.naviny.by*

## У БЕЛАРУСКАЙ МАДЭЛІ МОГУЦЬ ПАДЛАМІЦЦА НОЖКІ

► СТАР.5

## ПРЫГОЖАЕ ГЛУПСТВА

### ПАМЕЖНЫ ІНЦЫДЭНТ У НОВЫМ ЭСЭ АЛЕГА АБЛАЖЭЯ

► СТАР.7

# ЧАМУ ПАЛОВА БЕЛАРУСАЎ НЕ ВЕДАЕ, ШТО ЭКС-КАНДЫДАТ У ПРЭЗІДЭНТЫ АЛЯКСАНДР КАЗУЛІН — У ТУРМЕ?

**СЯРГЕЙ АЛЬФЕР, НАМЕСНІК СТАРШЫНІ АБ'ЯДНАНАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ПАРТЫІ:**

## "ІНФАРМАЦЫІ ПРА КАЗУЛІНА НЯМА НА ТЭЛЕБАЧАННІ"

Таму што інфармацыі пра Казуліна няма на тэлебачанні. Беларусы ў сваёй большасці глядзяць зараз толькі тэлевізар. А паколькі на сённяшні дзень усё тэлебачанне ў нашай краіне дзяржаўнае, таму яны і не могуць нічога даведацца. Вельмі невялікая колькасць жыхароў Беларусі чытаюць газеты, і яшчэ меншая колькасць чытае газеты, якія лічацца незалежнымі. Таму праўдзівую інфармацыю могуць атрымаць літаральна некалькі працэнтаў. Яшчэ адзін прыклад. Нядаўна старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Лябедзька і кіраўнік абласной арганізацыі Істомін былі ў Астраўцы, дзе жыў наш актывіст Іван Крук, праваабаронца, які дапамагаў вялікай колькасці жыхароў горада. Яны пайшлі на мясцовы рынак і казалі людзям, што Івана Крука асудзілі на шэсць месяцаў. І зноў — пераважная колькасць жыхароў не ведала пра гэта. А наконт грамадства… Яно такое, якое ёсць. Іншага не будзе. Але напэўна, на сённяшні дзень не можам мы зрабіць свае інфармацыйныя нагоды настолькі цікавымі, каб грамадства змагло імі зацікавіцца і падтрымаць нас.

**АЛЕГ МАНАЕЎ, НЕЗАЛЕЖНЫ САЦЫЁЛАГ:**

## "ГАЛОЎНАЯ ПРЫЧЫНА Ў КАНТРОЛІ ДЗЯРЖАВЫ НАД СМІ"

З аднаго боку, тут прычына ў манапольным становішчы беларускай прапаганды, што абмяжоўвае альтэрнатыўную інфармацыю. А ў справе Казуліна вельмі мала было інфармацыі ў афіцыйных СМІ. Большая частка такой інфармацыі даходзіла да людзей праз нефармальныя камунікацыі і крыніцы. А з іншага боку, вельмі шмат беларусаў, якія не цікавяцца палітычнымі падзеямі. І не ў тым справа, што яны баяцца. За інфармацыю не арыштуюць, не пасадзяць, з работы не звольняць. Але — не цікавяцца.

**АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ, ПРАВААБАРОНЦА:**

## "ЧАСТКА ЛЮДЗЕЙ НЕ ЦІКАВІЦЦА НІЧЫМ"

Па-першае, частка насельніцтва не цікавіцца нічым. І не дзіва было, калі пасля першых гадоў праўлення Лукашэнкі нават пэўны працэнт не ведаў, хто там рэальна ў нас прэзідэнт. А па-другое, і гэта самая асноўная прычына, – адсутнасць дастатковай і поўнай інфармацыі пра тое, што адбываецца ў краіне. Бо даволі шмат людзей, якія глядзяць толькі тэлевізар. Яны не чытаюць газет, не слухаюць радыё. Адкуль яны могуць ведаць пра Казуліна, калі ў нас няма магчымасці даведацца пра ягоны лёс у тэлевізары? Тая інфармацыя, якая тычылася яго падчас выбараў, можа, яна да кагосьці дайшла. А што было пазней... Людзі ўжо мала маглі зарыентавацца ў сітуацыі. Няма такога грамадства, дзе сто працэнтаў людзей цікавяцца тым, што адбываецца ў краіне. Гэтая праблема існуе сёння паўсюль.

**ЗОЯ, ПЕНСІЯНЕРКА:**

## "СПРАВА Ў ПРЫНЦЫПЕ "МАЯ ХАТА З КРАЮ"

Таму што галоўным жыццёвым законам беларускага народа застаецца правіла "мая хата з краю". Мяне не чапаюць, і добра. Абы ціха. А няма чаго было высоўвацца. І ўсё ў такім духу. І яшчэ адно. Казулін у многіх не выклікаў сімпатыі сваімі выступленнямі па тэлебачанні. Калі б ён быў менш агрэсіўным, саркастычным і больш чалавечным, дык, можа, ягоны лёс прыцягваў бы большую ўвагу з боку простых людзей.

**АНАТОЛЬ ЛЯЎКОВІЧ, ФІЛОСАФ, ПАПЛЕЧНІК КАЗУЛІНА:**

## "ІДЗЕ МАНІПУЛЯВАННЕ СВЯДОМАСЦЮ"

Ідзе маніпуляванне свядомасцю. Зразумела, у кожнай хаце ёсць радыёкропка, з якой цэлы дзень гавораць толькі тое, што патрэбна ўладам. І, зразумела, гэтая кропка маўчыць пра тое, што ёсць экс-кандыдат у прэзідэнты Казулін, што ён сядзіць за кратамі, адкуль нехта будзе нешта ведаць? Наш беларускі абываталь не горшы за нямецкага ці фінскага. Усё залежыць ад таго, як працуюць інстытуты, якія займаюцца ўплывам на масавую свядомасць.

**ТАЦЦЯНА, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## "НЕ СЕЗОН ЦІКАВІЦЦА ПАЛІТЫКАЙ"

Па-першае, гэтая інфармацыя не прысутнічае ў "тэлескрыні". А "скрыня" па-ранейшаму – галоўнае вакно для нашага чалавека ў свет. А па-другое, не сезон. Не сезон цікавіцца палітыкай. Зараз не першым месцы капанне бульбы, зборы дзяцей у школу, аксамітная восень і гэтак далей. Вось бліжэй да кастрычніка, можа быць, настане час для палітычных размоваў.

**КАНСТАНЦІН, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## "КАЗУЛІН СЯДЗІЦЬ НЕ Ў ІХ КРАІНЕ"

Палова беларусаў не ведае, што Казулін у турме, а палова, думаю, не ведае, хто такі Казулін увогуле. Значная частка беларусаў жыве не ў Беларусі, а ў нейкай "рэспубліцы", дзе ёсць НТВ, ОРТ, серыялы. Яны часам перакрыжоўваюцца, калі тралейбусы спыняюцца з-за якога-небудзь "Шляха". Але гэта было даўно, усе забыліся. Таму навіны з гэтага свету, дзе Казулін сядзіць у турме, да іх проста не даходзяць. Яны для іх неактуальныя.

А вось здымуць якога-небудзь Патрушава, кіраўніка расійскага ФСБ, ці не – спыні любога на вуліцы, ён табе распавядзе ўсё з падрабязнасцямі. Таму што для іх гэта адзіная інфармацыйная рэальнасць, якая існуе. Куды Пуцін ездзіў, губернатар якога края пракраўся. Гэтыя падзеі адбываюцца ў іхнай інфармацыйнай краіне. А там, дзе нешта адбываецца з Казуліным… Трэба быць адмыслоўцам, каб цікавіцца такімі тонкасцямі ды падрабязнасцямі. І не таму, што яны не любяць Казуліна. Ён проста сядзіць у турме не ў іх краіне.

**Каментар – на стар. 4.**

# ЛУКАШЭНКА ЗРАБІЎ “НЕДАТЫКАЛЬНЫМІ” АМАЛЬ УСІХ ЧЫНОЎНІКАЎ

*Новы ўказ №426 істотна пашырае спіс асобаў, якіх можна прыцягнуць да крымінальнай адказнасці толькі з дазволу кіраўніка дзяржавы. Гэты дакумент цалкам мяняе ўсю крымінальна-працэсуальную сістэму Беларусі.*

Калі раней недатыкальнасцю карысталіся толькі дэпутаты Нацыянальнага сходу РБ, дык цяпер у спіс патрапілі прэм’ер і віцэ-прэм’еры, старшыні раённых, абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў, кіраўнікі пракуратуры, пачынаючы з абласнога ўзроўню, міністры і намеснікі міністраў, а таксама ўсе без выключэння кіраўнікі сілавых структур – МУС, КГБ, Рады бяспекі, Камітэту дзяржкантролю, Міністэрства абароны, Службы бяспекі прэзідэнта і г.д.

Недатыкальнымі становяцца начальнікі абласных УУС і Мінгарвыканкаму, а таксама кіраўнікі адміністрацыі прэзідэнта і ўсіх упраўленняў гэтай адміністрацыі.

Падобная сістэма існавала і ў СССР. Праўда, гэтае палажэнне не было замацавана законам. Цяпер лёс усіх чыноўнікаў, якія здзейсняць злачынства, будзе згодна з законам аднаасобна вырашаць кіраўнік дзяржавы.

Характэрна, што новы ўказ не будзе апублікаваны. Яго плануецца толькі давесці да ведама асобаў, якія цяпер становяцца недатыкальнымі, і тых, хто будзе даваць санкцыі на крымінальны пераслед таго або іншага грамадзяніна.

У прэзідэнцкай адміністрацыі адмаўляюцца пацвердзіць існаванне ўказа. Але ж дыму без агня не бывае...

**Паводле СМІ**

# НЕ ДАЗВОЛЕНА СУСТРЭЧА З МІЛІНКЕВІЧАМ

За подпісам намесніка старшыні гарвыканкама Фёдара Міхеенкі група магілёўскіх грамадзянаў атрымала адмоўны адказ на сваю просьбу аб правядзенні ў горадзе адкрытай сустрэчы з Аляксандрам Мілінкевічам. Меркавалася, што такая сустрэча адбудзецца 30 верасня на Савецкай плошчы. Аднак гарвыканкам нагадаў заяўнікам, што цяперашняя ўлада месцам правядзення апазіцыйных мерапрыемстваў вызначыла схаваную за плотам пляцоўку на ўскрайку горада. Актывісты, што запрасілі Мілінкевіча ў горад для размовы з людзьмі, больш не маюць жадання збірацца “ў рэзервацыі”. Аб’яднаныя магілёўскія дэмакраты лічаць прынцыповым правядзенне такой сустрэчы ў шырокім і свабодным фармаце.

**belngo.info**

# ВОЛЬГА ЗАВАДСКАЯ: «ЗА ШТО ЎЗНАГАРОДЫ?»

*Маці выкрадзенага журналіста Змітра Завадскага Вольга Завадская пракаментавала ўзнагароджанне Аляксандра Лукашэнкі ордэнам праваслаўнай царквы ў гонар Кірылы Тураўскага.*

“Выглядае, у нашай дзяржаве лічыцца нармальным, калі царква ўзнагароджвае ордэнамі людзей, абвінавачаных у забойствах і выкраданнях. Усё заканамерна – праваслаўная царква крочыць услед за ўладай, яны падтрымліваюць адно аднаго хто фінансава, хто ордэнамі. Колькі гадоў мы крычым аб нашай бядзе, і ўсё дарэмна. За што яны атрымліваюць узнагароды?” — задае журналістам рытарычнае пытанне Вольга Завадская.

**Прэс-цэнтр “Хартыі-97”**

# САЮЗ БЕЛАРУСІ І РАСІІ: ”ПАГАДНЕННІ НЕ ВЫКОНВАЮЦЦА”

*26 верасня адбылося пасяджэнне ўраду “Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі” з удзелам беларускага прэм’ер-міністра Сяргея Сідорскага і кіраўніка расійскага ўраду Міхаіла Фрадкова. Бакі абмяняліся ўзаемнымі прэтэнзіямі.*

“Падпісваюцца чарговыя пагадненні, але потым іх ніхто не выконвае”, — заявіў сакратар Саюзу Павел Барадзін.

За некалькі дзён да сустрэчы ў Маскве Барадзін заявіў, што рэферэндум у справе канстытуцыйнага акту беларуска-расійскай федэрацыі можа адбыцца яшчэ сёлета ў снежні. Але выявілася, што гэта была галаслоўная заява.

Цягам бліжэйшых двух гадоў у Расіі адбудуцца парламенцкія, а потым прэзідэнцкія выбары. Згодна з расійскім заканадаўствам, у гэты перыяд забараняецца праводзіць рэферэндумы, якія тычацца канстытуцыі РФ.

Мінск, які застаецца бліжэйшым саюзнікам Масквы, нечакана выказаў упартасць перад яе эканамічным ціскам. Расійская прэса пісала яшчэ ўвесну, што Пуцін загадаў пазбавіць Беларусь усіх эканамічных прэферэнцыяў, а Газпром вось ужо некалькі месяцаў палохае беларусаў падвышэннем цэнаў на расійскі газ. У замен на больш нізкія цэны Газпром патрабуе кантролю над часткай беларускіх газаправодаў. Пагадненне аб гэтым мелася быць падпісаным да заканчэння верасня, але прэм’ер Фрадкоў паведаміў аб працягу перамоваў у гэтай справе ажно да заканчэння году.

**Паводле Gazety Wyborczej**

## СУСЕДЗІ

# ХТО КІТАЮ СЯБРА?

*У сваім імкненні сябраваць з Кітаем Лукашэнка не арыгінальны. З не меншым імпэтам “распрацоўваюць” усходнюю звышдзяржаву нашы паўночныя суседзі – Латвія і Літва. Там, праўда, кітайскую мову ў школах не ўводзяць, а кіруюцца чыста эканамічнымі інтарэсамі.*

“Літва можа дапамагчы гаспадарцы Кітая і стаць для яго брамаю на рынкі еўрапейскіх дзяржаваў, — заявіў днямі ў Шанхаі прэзідэнт гэтай краіны Валдас Адамкус. Выступаючы на літоўска-кітайскім эканамічным форуме, ён зазначыў, што Кітай за дастаткова кароткі час зрабіў неверагодны эканамічны скачок і стаў адным з найважнейшых удзельнікаў сусветнай гаспадаркі. Адпаведна пастаўкі кітайскіх тавараў на літоўскія рынкі растуць з году ў год.

Тым часам лідэр латышскай Першай партыі і кандыдат на пасаду прэм’ер-міністра краіны Айнарс Шлесерс пайшоў ва ўсходняй тэматыцы яшчэ далей: “Латвія павінна стаць Ганконгам у новай Еўропе! – заявіў ён, — гэта значыць, краінай якая звязвае два вялікія рынкі”. З аднаго боку – Азія, з другога – Еўропа.

Між іншым, прадстаўнікі ўрадаў Латвіі і Літвы адмовіліся ўдзельнічаць у цырымоніі завяршэння дэмаркацыі мяжы паміж гэтымі краінамі і Беларуссю, запланаванай на пачатак кастрычніка і папрасілі перанесці цырымонію на больш позні тэрмін. Афіцыйная прычына – надзвычайная занятасць іншымі, больш важнымі справамі.

Калі нашы суседзі і сапраўды патрапяць стаць кітайскім “акном у Еўропу”, дык якая роля тады застанецца Беларусі, улада якой усё больш закрываецца ад заходняга свету, і дзе кітайскія тавары будуць непазбежна патрапляць у тупік?

**Аглядальнік**

# ЭРА МІЛАСЭРНАСЦІ

## 44% БЕЛАРУСАЎ НЕ ВЕДАЮЦЬ, ШТО АЛЯКСАНДР КАЗУЛІН СЯДЗІЦЬ У КАЛОНІІ

**Працяг са стар. 1**

кул" патрапляе і Казулін, які за сваё цалкам законнае жаданне паспаборнічаць з Лукашэнкам атрымаў ажно пяць з паловай гадоў турмы. Важна дадаць – не проста 5,5, а 5,5 – засакрэчаным у афіцыйных СМІ прысудам, так бы мовіць, без права перапіскі. А гэта для публічнага палітыка – нашмат больш цяжкае выпрабаванне, чым тыя пяць ці дзесяць гадоў у няволі. Гэта ў барацьбе публічных палітыкаў – удар ніжэй пояса, які нічым, апроч асабістай помсты, растлумачыць нельга. Бо гэта пакаранне – з асаблівым цынізмам. Ляжачага – б'юць.

Вяртаючыся да лічбы ў 44%, заўважу, што як няма за гэтай лічбай віны незалежных СМІ, так няма і віны беларускага грамадства. Няведанне ў грамадстве тлумачыцца найперш неспачуваннем. Казулін – чалавек палітычнага дзеяння, а такія звычайна не выклікаюць спагады. Тут у нас, як і па ўсім свеце дзейнічае закон палітычнага цынізму – пераможцаў не судзяць. Пры гэтым і грамадства на самым побытавым сваім узроўні разумее, што ніякіх выбараў не было, што асабіста Казулін пайшоў асабіста супраць Лукашэнкі і той яму "даў".

Што да пачуцця міласэрнасці ў грамадстве, дык яно нікуды не дзявалася. І пагрозы дзейнага прэзідэнта "скруціць камусьці галаву" ці "абламаць рогі" калі і ўспрымаюцца як "сільная палітыка", дык зусім не падзяляюцца. Пра гэта сведчыць хоць бы і цяперашняя гісторыя вілейскай дзяўчынкі, якая апынулася ў складанай сітуацыі ў Італіі.

Канфлікт вакол Вікі Мароз, у якім, дзякуй Богу, Лукашэнка асабіста не ўдзельнічае, сведчыць пра тое, што ў Беларусі ў прынцыпе нармальнае грамадства, і з міласэрнасцю ды спачуваннем у нас усё у парадку. Ніхто нікога не гвалтуе і нічога не замоўчвае, газеты не пішуць з'едлівых каментароў, і БТ з уласцівай яго дыктарам садысцкай усмешкай не расказвае прыдуманую ў суседнім кабінеце непраўдападобную хлусню. Грамадства ў цэлым схільнае не палітызаваць канфлікт і развязаць яго найбольш далікатным спосабам.



**Падлетак глядзіць** *мексіканскі серыял у краме электронікі. Барысаў. Фота з архіва.*

Можа быць, упершыню ў сваёй найноўшай гісторыі наша краіна сутыкнулася з канфліктам, у якім трэба выявіць максімум гуманізму. Не маючы такіх традыцый на дзяржаўным узроўні, мы мусім ісці насуперак дубаломнай дзяржаўнай ідэалогіі і зусім не тым шляхам, якім вырашае праблемы дзейны прэзідэнт.

Выбар стаіць няпросты. Афіцыйныя ўлады РБ патрабуюць вярнуць дзяўчынку, якую фактычна скрала італьянская сям'я, бо не аформіла папераў на ўдачарэнне, і, нібыта, маюць рацыю. Італьянская сям'я і сама дзяўчынка разумеюць, што пасля вяртання Вікі ў вілейскі інтэрнат шчаслівага лёсу для яе не будзе. І таксама, нібыта, маюць рацыю. Прагматычныя італьянцы мітынгуюць, каб Віку Мароз вярнулі на радзіму, бо яе забралі з парушэньнем закона, і цяпер тысячы іншых італьянскіх сем'яў будуць пазбаўленыя надзеі забраць у свае сем'і беларускіх сірот. Адна Віка – трагедыя, тысячы Вік – статыстыка?

Чым скончыцца гісторыя Вікі Мароз? Што пераможа – міласэрнасць ці яе антыпод – прымітыўная помста чыноўніка? Ці Віка будзе вернутая на радзіму? Ці яны застанецца ў Італіі? Ці будзе абраны трэці варыянт – скажам, беларускі бок прызначыць нагляд за яе лёсам там і пры гэтым не будзе замінаць іншым сіротам з Беларусі быць прынятымі ў італьянскія сем'і? Сітуацыя чыстай гуманістычнай праверкі для грамадства, для краіны, для дзяржавы. Лішне казаць, што якраз апошні варыянт быў бы найлепшым для ўсіх.

Прадбачыць на ўсе сто, як беларуская дзяржава здасць свой гуманістычны іспыт, немагчыма. Але прынамсі сёння грамадскі фон вакол гэтай гісторыі выглядае спрыяльна. Мы пераконваемся, што "Беларусь без Лукашэнкі" можа быць краінай без замоўчвання і хлусні. На такім фоне асуджэнне Казуліна і замоўчванне прысуду выглядаюць не менш абсурдна, чым выглядалі б у прыгаданых напачатку Польшчы альбо ЗША. На гэтым фоне адразу відаць неадэкватнасьць "злачынства" і пакарання і матываванасьць яго не судом, але асабістым судзілішчам неміласэрнага экс-патрона.

**Алесь Кебік**

# ЗІМУ, ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ, ПЕРАЗІМУЕМ

## АЛЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ “СУПЕР-МАДЭЛІ” МОГУЦЬ ПАДЛАМІЦЦА НОЖКІ

Рабіць прагнозы – справа няўдзячная. Асабліва, калі жывеш у Беларусі. Зашмат няпэўнасці, непрадказальных асобаў і фактараў уплываюць на наша з вамі штодзённае жыццё.

Таму зробім два прагнозы – аптымістычны і песімістычны. У прынцыпе, верагоднасць таго або іншага варыянту залежыць толькі ад аднаго, але вельмі важнага складніка. Гэта цана на газ. Залежнасць простая: чым вышэй цана, тым горшыя наступствы для эканомікі.

Беларуска-расійская газавая спрэчка, якая на пачатку лета ўзрушыла была грамадства, здаецца, адышла на другі план. На яе амаль забыліся. І ні расійскі, ні беларускі бакі не даюць сур’ёзных інфармацыйных падставаў, каб вяртацца да гэтай спрэчкі. Зразумела, “пад коўдрай” працягваецца барацьба за найбольш выгаднае для кожнага з бакоў рашэнне. Але да канкрэтных вынікаў справа пакуль не даходзіць.

Матэматыка, аднак, простая. Калі Беларусь будзе купляць газ па ранейшай цане, альбо яна павысіцца не больш як на 10-15%, то заўважных зменаў не адбудзецца. У цяперашнім стане эканоміка Беларусі можа існаваць досыць доўга. Ні развіцця, ні заняпаду. Як і ў мінулыя гады, цэны на прадукты харчавання, камунальныя паслугі, на транспарт будуць павышацца. Але паступова, без рэзкіх усплёскаў, да чаго жыхары Беларусі даўно прызвычаіліся і на што ўжо амаль не звяртаюць увагі. Менавіта на такі варыянт разлічвае урад Беларусі ў сваім прагнозе развіцця краіны на 2007 год.

Варта адзначыць, што гэта даволі легкадумна з боку ўраду, бо няма сёння аб’ектыўных фактаў, якія б сведчылі пра гэткі выключна спрыяльны варыянт развіцця падзей. Яшчэ на пачатку лета намеснік міністра эканомікі Уладзімір Найдунаў казаў, што прагнозаў сацыяльна-эканамічнага развіцця будзе два, і адзін з іх будзе ўлічваць магчымасць рэзкага павышэння цэнаў. Аднак, другі варыянт прагнозу на свет так і не з’явіўся. Напэўна, таму, што нікому не хочацці ісці ў самы высокі кабінет з сумнымі лічбамі, бо, як вядома, ганцу з дрэннымі весткамі першаму адсякаюць галаву.

Калі цана на газ павялічыцца ўдвая і дасягне 100 даляраў за тысячу кубаметраў, то, паводле прагнозу таго ж Міністэрства эканомікі, гэта “выкліча пэўныя зрухі ў інфляцыі і выдатках”. У перакладзе на звычайную мову гэта азначае, што цэны на ўсё без выключэння ўзрастуць у сярэднім у паўтара раза. Прычым, павялічваць зарплату не будзе за кошт чаго, бо і паступленні ў бюджэт знізяцццца на траціну. У гэтым выпадку ўдар па дабрабыце беларусаў будзе вельмі адчувальным.



**Пажылая кабета** *на кірмашы. Мінск, жнівень 2006 году.*

Але адбудзецца гэта не раптоўна – ва ўлады ёсць пэўныя рэзервы, каб цягам трох-чатырох месяцаў утрымліваць сітуацыю пад кантролем. Так што зіму, хутчэй за ўсё, перажыць удасца. Але рост цэнаў непазбежны, у першую чаргу – на камунальныя паслугі.

І нарэшце, трэці варыянт – цана на газ дасягне 160-200 даляраў, аб чым, дарэчы, увесь час гаворыць “Газпром”. Але наўрад ці расійскія ўлады пойдуць на такі рызыкоўны эксперымент. Бо для беларускай эканомікі гэта стала б смяротным шокам. Пры такім варыянце эканоміка Беларусі будзе адкінутая ў пачатак 1990-х гадоў, калі цэны на ўсе тавары былі астранамічныя, а даходы – мізэрныя.

Між іншым, Малдова ўжо купляе расійскі газ па 190 даляраў за тысячу кубаметраў. А краіны Балтыі і Заходняй Еўропы – яшчэ даражэй. І нічога катастрафічнага з эканомікай гэтых краінаў не адбываецца. Бо ўрады гэтых краінаў даўно адмовіліся ад спадзяванняў выключна на эканамічныя мыліцы ў выглядзе танных расійскіх энерганосьбітаў. Пазбаў беларускую эканамічную мадэль гэтых мыліцаў – і ў гэтай супермадэлі падломяцца танюсенькія ножкі, на якіх трымаецца надзея на стабільнасць і заўсёдную “чарку са шкваркай”.

**Алег Ман**

**У цяперашнім стане эканоміка Беларусі можа існаваць досыць доўга. Ні развіцця, ні заняпаду. Як і ў мінулыя гады, цэны на прадукты харчавання, камунальныя паслугі, на транспарт будуць павышацца. Але паступова, без рэзкіх усплёскаў, да чаго жыхары Беларусі даўно прызвычаіліся. Менавіта на такі варыянт разлічвае ўрад у сваім прагнозе развіцця краіны на 2007 год.**

# ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ САЮЗНІК НЕ ХОЧА ДЗЯЛІЦЦА НАФТАЙ?

## АЛЬБО ГІНЕКОЛАГ СТАВІЦЬ ДЫЯГНАЗ ГРАМАДСТВУ

Напэўна, да 2009 году, калі ў Егіпце адбудзецца наступны саміт краін недалучэння, мы будзем бачыць на старонках дзяржаўных газет усё новыя ацэнкі Гаванскага форума. І чым далей, тым больш дзёрзкія. Такія, як у журналіста газеты "7 дней" Віктара Логвіча, напрыклад:

*"Беларусь предстала в Гаване идеологом перестройки движения. После саммита наша республика вместе с влиятельными в мире странами Венесуэлой и Ираном создала своеобразный политический треугольник, который из-за неуступчивости лидеров Лукашенко, Чавеса и Ахмадинеджада будет довольно трудно трансформировать в более удобную для сильных мира сего геометрическую фигуру.*

*Можно задаться естественным вопросом: а что все это даст белорусскому народу? Чтобы понять выгоды, которые мы получим от более тесного взаимодействия, например, со странами Латинской Америки, стоит привести один конкретный пример. Уже несколько лет Беларусь добивается того, чтобы получить на территории России возможность самой вести разведку и добычу нефти. Однако пока сделать это так и не удалось. А вот Венесуэла согласилась предоставить Беларуси нефтяное месторождение с объемом добычи 10 млн. тонн в год. Скажете, очень далеко. Да, далеко. Но ведь нефть можно добывать, перерабатывать на месте и продавать тем же США, а за вырученные деньги покупать, например, газ. Кстати, во время визита в Венесуэлу Государственного Секретаря Совета безопасности Беларуси Виктора Шеймана было подписано 23 соглашения. Мировая пресса особо выделяет факт заключения контрактов в сфере военно-технического сотрудничества, которые потянули на 1 млрд. долларов. Как заметил Виктор Шейман, подписанные контракты обеспечат предприятия ВПК республики «работой на многие-многие годы».*

Адным словам, камандзіровачныя затраты, пералёт на Кубу ледзь не праз Паўднёвы полюс былі не дарэмнымі. Можа, сапраўды, для Беларусі Афрыка і Лацінская Амерыка – галоўныя стратэгічныя партнёры ў будучыні? Але тады навошта нам тая Саюзная дзяржава з Расіяй, якая не хоча дзяліцца саюзнай нафтай?

Газета "Звязда" ўзяла інтэрвію ў міністра замежных спраў Расіі Лаўрова. Тэма для гутаркі знайшлася "свежая". Лёс Саюзнай дзяржавы.

*"— Некаторыя лічаць, што інтэграцыя паміж Беларуссю і Расіяй дасягнула той кропкі, пасля якой бакі ўжо не могуць рабіць крокі насустрач, бо рознагалоссі наконт будаўніцтва Саюзнай дзяржавы з'яўляюцца надзвычай вялікімі?*

*— Мне здаецца, што тыя структуры, якія ўжо сфарміраваны ў рамках Саюзнай дзяржавы, працуюць і вырашаюць адпаведныя пытанні.*

*— З'явілася інфармацыя, што ЗША разглядае магчымасць прыняцця новага Акта аб дэмакратыі ў Беларусі. Як Расія ставіцца да гэтага?*

*Гэта будзе, напэўна, не першы раз, калі амерыканскі кангрэс спрабуе дыктаваць свае ўмовы розным краінам і выстаўляць розным краінам адзнакі за паводзіны. У нас іншыя падыходы да сусветных спраў. Мы будуем свае адносіны з іншымі дзяржавамі на аснове ўзаемнай павагі, на аснове жадання і ўмення разумець іх унутраныя асаблівасці, традыцыі і звычаі".*

Калі паспрабаваць перакласці тое, што сказаў Лаўроў, з дыпламатычнай мовы на мову чалавечую, дык атрымліваецца, што да традыцый і "ўнутраных асаблівасцей" расійскі бок адносіць звычай хапаць і збіваць усіх і кожнага, каму любыя нацыянальная сімволіка і родная мова. Альбо зачыняць незалежныя выданні, саджаць у турмы апанентаў. Што ж, усяго гэтага, вядома, хапала ў гісторыі расійскай імперыі. Ды й зараз хапае. Вось на якіх традыцыях, на якім грунце, аказваецца, стаіць так званая саюзная дзяржава Беларусі і Расіі.

"Народная газета" закранае тэму дэмаграфіі. У чым тут праблема? А вось у чым:

*"Вспоминается беседа с врачом-гинекологом Владимиром СИЛЯВОЙ, который очень точно заметил: "Только когда изменится ситуация в обществе, когда иной будет атмосфера в средствах массовой информации, тогда женщинам легче будет осознать, что рождение ребенка является несравненно большей ценностью среди других жизненных ценностей.*

Як бачым, сучасную сітуацыю ў грамадстве лекар-гінеколаг абмаляваў вельмі трапна. Асабліва ў тым, што тычыцца атмасферы ў СМІ. Бо начытаўшыся за тыдзень беларускай афіцыйнай прэсы, шмат чаго можна захацець. Але менш за ўсё захочацца рабіць для такой дзяржавы новых людзей.

**Алесь Канюціч**

# СПЯКОТНА НАМ БУДЗЕ Ў ПЕКЛЕ...

## АЛЬБО "ЗАБАДАЙ ЦЯБЕ КАМАР"

Чаго цяпер толькі не пачуеш. Гэта раней было, што нідзе нічога ніякага. Глушылі. А цяпер гавары, колькі хочаш, праблема толькі – выбраць, каб што добрае пачуць. Вось, напрыклад, адбылася ў мінулыя выходныя сустрэча лідэраў трох вялікіх дзяржаваў – Пуціна, Шырака і Меркель. На прэс-канферэнцыі, паміж усяго іншага, запыталіся ў спадара Пуціна пра трэці прэзідэнцкі тэрмін, маўляў, і законапраект, які б дазваляў гэта, ужо ёсць у парламенце. Пуцін выразна адказаў чарговы раз: не. Падзякаваў тым, хто так высока цэніць ягоную работу і прапануе застацца на пасадзе прэзідэнта, але Канстытуцыю парушаць нельга. І хай сабе Пуцін "лукавит", хай сабе марыць пра гэткую ж самую ўладу, як у Лукашэнкі, але ў гэты момант гэтая канкрэтная фраза трапна б'е па нашым дыктатары. І такую фразу трэба тыражаваць і тыражаваць. Але на частаце 612 кілагерц* я пра гэта не пачуў, перадалі толькі, што сустрэча такая адбылася, дамовіліся пра эканамічнае супрацоўніцтва...

А цяпер пра тое, што прыемна ўразіла. На прэзентацыю беларуска-англійскага слоўніка прыляцелі на радзіму спадары Кіпель і Запруднік. Пад час аднаго з інтэрвію спадар Запруднік шчыра здзівіўся: "Мы не ад-

СТРЭМКІ

# ІНЦЫДЭНТ

## “МЯЖА, ЯКАЯ АБ’ЯДНОЎВАЕ, А НЕ ДЗЕЛІЦЬ” – ПРЫГОЖАЕ ГЛУПСТВА

Днямі ў Вільні прадстаўляў сваю кнігу “Галасы разбуджаных птушак” гісторык і краязнаўца з Маладзечна Міхась Казлоўскі.

Кніга пісалася не адзін год – аўтар па крупіцы знаходзіў звесткі пра напаўзабытых або і зусім невядомых дзеячоў беларускага адраджэння.

Гэтая не такая ўжо й вялікая кніга вартая асобнай размовы, а галоўнае – прачытання. Каб лепш зразумець, хто мы такія, што з намі адбываецца, і хто змагаўся за тое, каб мы мелі права “людзьмі звацца”.

Былі сустрэчы з сябрамі, размовы са старымі беларусамі, якія яшчэ дажываюць свой век у Вільні.

І ўрэшце настала пара ад’езду. Міхась выехаў цягніком “Вільнюс-Мінск”, што адыходзіць у 6:20 раніцы.

І – прапаў.

У сваім родным горадзе ён не з’явіўся – ані той раніцай, ані пад вечар. Можна ўявіць сабе пачуцці ягонай жонкі, нас, сяброў, — у галаве круціліся самыя невясёлыя сцэнарыі.

Урэшце Міхасёва жонка Тамара патэлефанавала на памежны пераход, дзе ёй паведамілі, што з таго цягніка быў ссаджаны “мужчына”, але невядома, ці гэта быў Казлоўскі.

Аднак, як познім вечарам высветлілася, гэта быў усё ж ён – і дабраўся дадому іншым цягніком.

“Правіннасць” нашага госця была такая: пры ўездзе на тэрыторыю Літвы ён на пытанне памежніка адказаў, што збіраецца прабыць тут 5 сутак, а пры выездзе аказалася, што прабыў на 2 гадзіны больш.

У выніку наш госць быў пасаджаны ў закратаваны пакой, дзе яму не далі патэлефанаваць дахаты ці сябрам у Вільні, і трымалі галоднага ўвесь дзень. Вядома ж, не кампенсавалі і страчаны білет.

Нашы новыя “радыёгаласы” і незалежны друк ствараюць уражанне, што варта пераступіць заходнюю мяжу – і нас сустрэнуць спрэс дабразычлівыя і справядлівыя людзі.

Каб жа так! Бясспрэчна, Еўропа нам дапамагае, нас падтрымлівае, але ў ёй, як у Грэцыі з чэхаўскага апавядання, “ёсць усё”. Ёсць дурні, ёсць мярзотнікі, ёсць несправядлівасць. Па той бок клеткі – не цяпліца, а джунглі.

Сапраўды, віза, якую меў Міхась, дазваляла яму знаходзіцца ў Літве 30 дзён, ён меркаваў прабыць пяць, яго планы маглі змяняцца, прычым карэктывы маглі сыходзіць, напрыклад, ад раскладу руху цягнікоў. Аднак, карэктывы ўнесла не ягонае жаданне, не расклад і нават не літоўскі закон, а злая воля асобнага надзеленага ўладай функцыянера – насуперак жаданню, раскладу і закону.

Мяжа ёсць непазбежнае зло. Вядома, наркотыкі, тэрарысты, нелегальныя мігранты... Парадак павінен быць.

Але ці гэта можа апраўдаць ператварэнне мяжы ў лінейны канцлагер, на тэрыторыі якога любы уніфармаваны асобнік можа сцерці цябе ў “лагерны пыл”?

“Мяжа, якая аб’ядноўвае, а не дзеліць” – прыгожае глупства. Аксюмарон накшталт “сухой вады” або “халоднага агню”.

Мяжа – толькі размяжоўвае. Дзеліць.

А цяперашняя мяжа паміж Вільняй і Беларуссю – шнар, які будзе смылець заўсёды. І ёсць вельмі шмат людзей, што зацікаўленыя, каб зрабіць яе яшчэ больш балючай.

І сцяну будуюць з абодвух бакоў. Няўжо – назаўсёды?

**Алег Аблажэй**

---

чуваем сябе адарванымі ад бацькаўшчыны. Дзякуючы сучаснай камунікацыі, мы штодня разам і робім...” І сапраўды, робяць. Дай Бог кожнаму з нас, нягледзячы ні на якія адлегласці ў прасторы і часе, адчуваць заўсёды такую злучанасць з Радзімай.

А яшчэ пачуў я новыя словы. Можа, нехта назаве мяне анахраністам, але навошта такія новыя, калі і старыя някепскія? 26 верасня, Радыё Рацыя, Янка Багушэвіч: “трэба збадаць пытанне”. А я думаю, лепей вывучыць жарт “забадай цябе камар”. 25 верасня, Еўрапейскае радыё для Беларусі (“Акно ў Еўропу”), Мікалай Карняйчук: “спякотныя кропкі”. Мусіць, спякотна будзе нам у пекле, а на зямлі дос нам і гарачых кропак.

**Сяржук Вітушка**

**Сярэдняя хваля, на якой рэтранслююцца ўсе асноўныя незалежныя беларускія радыёстанцыі (рэд.).*

---

# НЕВЯДОМАЯ БЕЛАРУСЬ

**28 верасня** 1937 году савецкія карныя органы расстралялі беларускага драматурга, актора і рэжысёра, заснавальніка беларускага савецкага тэатра Ўладзіслава Галубка. Забойству не перашкодзіла нават тое, што Галубок быў першым народным артыстам Беларусі. Чалавек, які ўсё жыццё прысвяціў тэатру, напісаў 40 п’ес і выхаваў вялікае мноства прафесійных актораў, быў знішчаны паводле хлуслівага абвінавачання ў палітычнай дзейнасці.

**29 верасня** 1529 году пачаў дзейнічаць Статут Вялікага Княства Літоўскага (Першы Статут) – адзін з найлепшых помнікаў еўрапейскай прававой культуры эпохі Адраджэння быў створаны на беларускай мове і сведчыў пра вяршэнства закона ў дзяржаве нашых продкаў.

**1 кастрычніка** 1991 году пачаў працу Беларускі гуманітарны ліцэй, які пазней атрымае імя Якуба Коласа, а яшчэ пазней будзе зачынены пастановаю Савету Міністраў. Кіраўнік РБ назаве ліцэй “гняздом апазіцыі”.

**2 кастрычніка** 1323 году ў дакументах упершыню згадваецца Вільня, сталіца Вялікага Княства Літоўскага, якая з 1940 году стала сталіцай сучаснай Літвы, а датуль на працягу шасціста гадоў была сталіцаю ўсяго беларуска-літоўскага краю. У Вільні друкаваў першыя беларускія кнігі Францішак Скарына, з Вільні кіраваў паўстаннем Кастусь Каліноўскі, у Вільні пабачылі свет першыя беларускія газеты “Наша Доля” і “Наша Ніва”.

**4 кастрычніка** 1535 году з друку выйшла першая ў свеце Біблія на англійскай мове. Беларусы, дзякуючы Францішку Скарыну, атрымалі сваю Біблію па-беларуску ў 1517 годзе, гэта значыць, амаль на дваццаць гадоў раней за англічан.

# ВІТАЛЮ КУТУЗАВУ ПАГРАЖАЕ ВОЙСКА

## ФУТБАЛІСТ НАКЛІКАЎ НА СЯБЕ ГНЕЎ ЛУКАШЭНКІ

*Скандал вакол адмовы форварда Віталя Кутузава гуляць за футбольную зборную Беларусі мае падводныя камяні. Справа ў тым, што спартовец наклікаў на сябе гнеў кіраўніка дзяржавы.*

Пасля стартавай гульні з Албаніяй у рамках адборачнага цыклу Чэмпіяната Еўропы (матч скончыўся з нічыйным лікам 2:2), настаўнік зборнай Беларусі Юры Пунтус раптоўна адмаўляецца ад паслуг Віталя Кутузава. Прычына – ягоная "дрэнная фізічная форма" перад наступным матчам з Галандыяй. Форвард сапраўды выглядаў на полі не лепшым чынам, але, шчыра кажучы, наша нацыянальная каманда ўвогуле рэдка выглядае бліскуча. Тым больш нечаканым рашэнне Пунтуса выглядала з-за недахопу нападнікаў у той момант. А Кутузаў усё-ткі пры ўсіх сваіх хібах даўно гуляе ў вельмі моцным італьянскім чэмпіянаце, прычым не ў горшых камандах.

Даведаўшыся пра гэта, Кутузаў сцепануў плячыма і ў інтэрвію "Прэсболу" (7 верасня) выказаў сумнеў, што рашэнне зыходзіла ад галоўнага трэнера. У той публікацыі амаль адкрыта намякалася, што да яго спрычыніліся высокапастаўленыя заўзятары. Аднак Кутузаў зазначыў, што ў любым выпадку крыўды не трымае і ў наступных матчах гатовы выступаць за Беларусь.

Але праз дзесяць дзён у федэрацыю футбола прыйшоў факс, у якім форвард прасіў не выклікаць яго на гульні цяперашняга адборачнага цыклу, які будзе доўжыцца яшчэ каля году. Абгрунтаваў гэта Кутузаў пры дапамозе з'едлівай фармулёўкі – "жадаю набраць найлепшую фізічную форму".



**ГОЛ! Таварышы** *па зборнай віншуюць Віталя Кутузава з забітым мячом падчас адборачнага матчу Чэмпіяната Еўропы 2004 году паміж камандамі Беларусі і Малдовы. Мінск, 29 сакавіка 2003 году. Фота з архіва*

Цяпер Пунтус пераконвае Кутузава змяніць рашэнне, і ўжо на пачатку кастрычніка ізноў далучыцца да зборнай. Але той згоды пакуль не дае.

Што ж адбылося на самой справе? Паводле нашых звестак, Кутузаў у дрэнную хвіліну патрапіў на вочы Лукашэнку. Пад час гульні з албанцамі камера раз-пораз факусавалася на асобе форварда, які, нягледзячы на даволі няўдалую гульню, меў радасны выраз твару. Гэта надта не спадабалася Лукашэнку, і ён запатрабаваў пакараць Кутузава.

Першая ідэя, якая прыйшла ў галаву чыноўнікам, менталітэт якіх фармаваўся за савецкім часам – пазбавіць таго, хто праштрафіўся, замежнай паездкі. У нашым выпадку гэта выглядала тым больш смешна, што Кутузаў зараз жыве ў Італіі, а ў родную Беларусь наведваецца толькі на адпачынак і па выкліках зборнай Беларусі. Так што пакаралі ў выніку самі сябе, пакінуўшы каманду без гульца.

Але на гэтым справа не скончылася. Яшчэ адзін спосаб пакарання, добра вядомы з савецкіх часоў – абуць спартоўца ў вайсковыя боты. Відаць па ўсім, Кутузаў успрыняў гэтую пагрозу ўсур'ёз. Менавіта гэтым тлумачацца яго непаслядоўныя паводзіны. Калі форвард даведаўся пра магчымую перспектыву атрымаць позву з ваенкамату, жаданне наведвацца ў Беларусь у яго адразу знікла.

Зараз Кутузаву 26 гадоў. Прызыўны ўзрост сканчаецца ў 27, практычна адначасова з адборачным турнірам чэмпіяната Еўропы. Менавіта гэтым і тлумачыцца тэрмін, на які форвард адмовіўся выступаць за нацыянальную каманду.

Праз год войска Кутузаву ўжо пагражаць не будзе. Тады ён можа спакойна вярнуцца ў каманду. Праблема насамрэч не ў Кутузаву. Урэшце, адмовіўся ж новы трэнер зборнай Англіі ад паслуг знакамітага Дэвіда Бэкхема. Але ён зрабіў гэта з уласных меркаванняў, а не на загад Тоні Блэра ці каралевы.

У нас жа, здаецца, неўзабаве склад нацыянальнай каманды на кожную гульню трэнер будзе папярэдне зацвярджаць у прэзідэнцкай адміністрацыі. Бо ёсць у краіне чалавек, які лепш за ўсіх астатніх разбіраецца не толькі ў палітыцы і сельскай гаспадарцы, але і ў футболе, беларускай мове, правілах дарожнага руху і гэтак далей. Больш за тое, хакейная каманда, за якую гуляе Аляксандр Лукашэнка, вядомая тым, што ніколі і нікому не прайграе – нават сучасным зоркам. Можа, каб беларусам патрапіць на футбольны чэмпіянат Еўропы, варта яго выпусціць на поле замест Кутузава?

**Валеры Філін**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер"
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў